МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

10 сакавіка 2018 г. № 10 (443)

стар. 2

Што па сіле слабаму полу?

стар. 4,13

Ачышчальныя аб'екты пад кантроль аблвыканкамаў

стар. 16

Ёсць вуліцы Цэнтральныя...

ТЭМА ТЫДНЯ

АД БЯСПЕКІ ДА ЯКАСЦІ



Як у краіне вырашаюцца пытанні пітнога водазабеспячэння

Фота Анатоля КІЕШЧУКА.

СЁННЯ цяжка ўявіць, што яшчэ ў пачатку 2000-х гадоў нават у буйных гарадах краіны існавалі праблемы з доступам да якаснай пітной вады, дзейнасцю ці ўвогуле наяўнасцю сістэм каналізацыі... У выніку рэалізацыі Дзяржпраграмы «Чыстая вада» многія з гэтых пытанняў калі не зніклі з парадку дня, то страцілі сваю злабадзённасць. Але наколькі паспяхова адбываецца гэты працэс?

ВАДА — ПАКАЗЧЫК ДАБРАБЫТУ

Спецыялісты сцвярджаюць: якасная пітная вада па сваіх арганалептычных уласцівасцях, мікрабіялагічным і хімічным саставе павінна адпавядаць санітарным нормам і правілам. Ад яе якасці залежыць стан здароўя насельніцтва, узровень санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту, ступень камфортнасці і, як следства, сацыяльная стабільнасць грамадства.

стар. 4

СЕСІЯ

ФОРМА СА ЗМЕСТАМ

Дэпутаты Брэсцкага абласнога Савета падвялі вынікі работы 27-га склікання

У мінулую суботу дэпутаты папярэдняга складу сабраліся на форум, каб асэнсаваць пройдзенае, намеціць задачы, абазначыць праблемы, якія пераходзяць да новага складу. Тым больш што пэўная частка народных абраннікаў з цяперашняга Савета перайшлі ў новы.
Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Сяргей АШМЯНЦАЎ звярнуў асаблівую ўвагу на практыку выязных сесій.

Дэпутаты, на выезд!

Не толькі папярэдняе, але і тры мінулыя склікання аблсавет практыкаваў выязныя сесіі як найбольш аптымальную і наглядную форму вывучэння вопыту на месцах. Падчас выязнога форуму кожны народны абраннік мог пачуць цікавую для яго інфармацыю з першых вуснаў. За справаздачны перыяд такіх форумаў прайшло шэсць.

Выязная сесія ў Столінскім раёне на тэму прыцягнення ў абарот маёмасці, што не выкарыстоўваецца, стала школай найлепшага вопыту для многіх удзельнікаў. Як вядома, падобныя пытанні лепш вырашаюцца ў раёнах, якія размешчаны паблізу ад вялікіх гарадоў. Столін жа адзін з самых аддаленых ад цэнтра вобласці, а таксама ад сталіцы раёнаў, але мясцовыя органы ўлады працуюць даволі актыўна ў азначаным кірунку. Адно з памяшканняў былога ваеннага гарадка ў Давыд-Гарадку ператварылася пасля рамонту і рэканструкцыі ў дзіцячы садок. Месцаў у дашкольнай установе не хапала, і новы садок стаў вырашэннем сацыяльнай праблемы для многіх сем'яў.

стар. 3

Фота Аляксандра ШУЛЫГАЧА.

Удзельнікі аднаго з форумаў наведваюць Стрыгаўскі Дом культуры.